БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС



Валерый РОГАЧ,
Аляксандр ПУЦЭЙКА

# БЕЛАРУСЬ У ГАДЫ ПАЎНОЧНАЙ ВАЙНЫ 1700—1721 ГГ.

***VIII клас***

9(476)(09)

*Чаму вайна 1700—1721 гадоў называецца Паўночнай? Хто ў ёй удзельнічаў і якія яе вынікі для Беларусі? Аб гэтым вучні даведаюцца на ўроку.*

**Мэта ўрока:** пазнаёміць вучняў з прычынамі, ходам і вынікамі Паўночнай вайны 1700—1721 гг.

**Задачы ўрока:** замацаваць уменні і навыкі работы з вучэбнай і дадатковай літаратурай; развіваць мысленне, мову, уменне пераадольваць цяжкасці ў вучобе, стварыць атмасферу эмацыянальных перажыванняў; навучыць складаць сінквейн; садзейнічаць фарміраванню патрыятызму; выхоўваць цікавасць да гісторыі Бацькаўшчыны.

**Тып урока:** камбінаваны.

**Забеспячэнне ўрока:** Гісторыя Беларусі, другая палова XVI — канец XVIII ст. : вучэб. дапам. для 8-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. мовай навучання / В.А.Белазаровіч, І.П.Крэнь, Н.М.Ганушчанка. Мн., 2010; насценная карта "Рэч Паспалітая ў канцы XVI—сярэдзіне XVIII ст."; карткі з заданнямі; У.Арлоў. Таямніцы полацкай гісторыі. Мн., 1994; праектар.

**Новыя паняцці:** *Паўночная вайна, кааліцыя, канфедэрацыя, кантрыбуцыя.*

**Асобы:** *Аўгуст II Моцны, Карл XII, Пётр I, Станіслаў Ляшчынскі.*

**Падзея:** *28 верасня 1708 г. — бітва каля вёскі Лясная.*

**План урока**

I. Праверка дамашняга задання.
II. Вывучэнне новага матэрыялу.
  1. Прычыны і пачатак вайны.
  2. Баявыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі.
  3. Бедствы насельніцтва Беларусі.
  4. Вынікі і наступствы вайны.
III. Замацаванне новага матэрыялу.
IV. Рэфлексія.

*РОГАЧ Валерый Мікалаевіч.*



*Настаўнік гісторыі Асіпавіцкага НПК дзіцячы сад—сярэдняя школа. Нарадзіўся ў 1955 г. у в. Талуць Вілейскага р-на Мінскай вобл. У 1976 г. закончыў гістарычны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута. Працаваў настаўнікам гісторыі ў школе Глыбоцкага р-на, а з 1981 г. — у школах Вілейскага раёна. Мае вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю.*

*ПУЦЭЙКА Аляксандр Часлававіч.*



*Дырэктар Асіпавіцкага НПК дзіцячы сад—сярэдняя школа, настаўнік беларускай мовы і літаратуры. Нарадзіўся ў 1975 г. у в. Лукавец Вілейскага р-на Мінскай вобл. У 1997 г. закончыў факультэт беларускай філалогіі і айчыннай культуры БДПУ імя Максіма Танка. Працаваў у школах горада Вілейкі. Мае першую кваліфікацыйную катэгорыю.*



gisdapamoga.bspu.by

*"Моцныя арміі як з таго, так і з другога боку няспынна перакочваліся па Польшчы (маецца на ўвазе Рэч Паспалітая), ад іх нападу ні адзін чалавек любога саслоўя — ні ксёндз, ні шляхціц, ні грамадзянін, ні бедны селянін, ні яўрэй — не быў абаронены. На шляху, хто б ні сустракаўся, губляў тое, што меў: каня, вопратку, абутак, шапку; ваенныя, якія станавіліся пастоем у дварах, забіралі коней; сельская гаспадарка занепадала, бо гаспадар, выехаўшы ў поле, губляў коней і валоў". (З запісаў сучасніка падзей гісторыка Аквіноўскага.)*

## Ход урока

**I. Праверка дамашняга задання** праводзіцца двума спосабамі. Некалькі вучняў пісьмова выконваюць заданні на картках, з астатнімі вучнямі праводзіцца гутарка.

*Настаўнік.* Трэці ўрок запар мы разглядаем з вамі прычыны, ход і наступствы войнаў, якія адбываліся на тэрыторыі Рэчы Паспалітай, пачынаючы з сярэдзіны XVII стагоддзя. *Успомніце, тэрыторыю якіх краін закранулі падзеі вайны 1654—1667 гг. і вайны 1655—1660 гг. Якія былі мэты Расіі і Швецыі ў войнах 1654—1667 гг. і 1655—1660 гг.? Якія былі наступствы гэтых войнаў для насельніцтва Беларусі? Ці дасягнулі Расія і Швецыя сваіх мэтаў у войнах?*

Некалькі вучняў атрымліваюць карткі з індывідуальнымі заданнямі.

*Картка 1.*

Напішыце адказы на пытанні:

1. Якую ролю ў вайне 1654—1667 гг. адыгрываў рэлігійны фактар?

2. Якія абяцанні даваў расійскі цар Аляксей Міхайлавіч праваслаўнай шляхце, сялянам, гараджанам?

*Картка 2.*

Размясціце падзеі ў храналагічным парадку:

а) капітуляцыя расійскага гарнізона ў Віленскім замку;

б) разгром войска ваяводы І.Хаванскага ў бітве пад Кушлікамі (каля Полацка);

в) захоп расійскімі войскамі Мінска, Навагрудка і Ліды;

г) захоп расійскімі войскамі Вільні;

д) паражэнне расійскіх войск пад камандаваннем ваяводы І.Хаванскага ў Палонкаўскай бітве (пад Ляхавічамі). *Адказ:* в — г — д — б — а.

**II. Вывучэнне новага матэрыялу.**

***1. Прычыны і пачатак вайны.***

Настаўнік дэманструе на экране пустую табліцу "Паўночная вайна 1700—1721 гг. на тэрыторыі Беларусі" і прапаноўвае вучням на працягу тлумачэння першага пункта запоўніць дзве калонкі табліцы ў сшытках.

| Краіны-удзельніцы вайны | Прычыны вайны | Ход вайны | Вынікі вайны |
|---|---|---|---|
| | | | |

*Настаўнік.* Падпісанне 30 студзеня 1667 г. Андросаўскага перамір'я спыніла вайну 1654—1667 гг., якая забрала жыцці кожнага другога беларуса і прывяла да скарачэння тэрыторыі ВКЛ з 370 да 312 тыс. км$^2$. Аднак жаданне Расіі атрымаць выхад у Балтыйскае мора ў выніку той вайны не спраўдзілася.

У канцы XVIII ст. у Еўропе склаўся новы ваенны саюз: Данія і Расія, занепакоеныя дыктатам Швецыі на Балтыйскім моры, заключылі пагадненне, накіраванае супраць гэтай краіны. Пазней да гэтага саюза далучыліся Саксонія і Рэч Паспалітая. Падпісаны ў 1699 г. тайны Праабражэнскі дагавор паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй прывёў да афармлення так званага *Паўночнага саюза*.

Мэты *кааліцыі* (палітычны і ваенны саюз дзвюх і больш дзяржаў) былі наступныя:

— не дапусціць далейшага ўзвышэння Швецыі ў Паўночнай Еўропе;

— ліквідаваць лідарства Швецыі на Балтыйскім моры;

— Рэч Паспалітая хацела атрымаць частку лівонскіх зямель;

— Расія жадала атрымаць выхад у Балтыйскае мора.

Аднак вайна, якая пачалася ў 1700 г. з аблогі Рыгі саксонскімі войскамі і з акупацыі Даніяй герцагства Гольштэйн, у далейшым пайшла "пад дыктоўку" шведскага караля Карла XII.

Войскі Пятра І у 1700 г. атрымалі цяжкае паражэнне ад шведаў у бітве пад Нарвай, у 1701 г. саксонскае войска было разбіта пад Рыгай. У 1702 г. шведы занялі Вільню, Гродна, Варшаву. Пачынаючы з 1702 г. беларускія землі сталі арэнай баявых дзеянняў. *(Настаўнік адначасова з расказам дэманструе слайды з выявамі каралёў ваюючых дзяржаў і паказвае на карце Нарву, Рыгу, Вільню, Гродна, Варшаву).*

Напрыканцы расказа настаўнік просіць вучняў назваць удзельнікаў Паўночнага саюза і вызначыць мэты ўдзельнікаў вайны.

***2. Баявыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі.***

Вывучэнне гэтага пункта плана ажыццяўляецца ў групах.

*Першая група* запаўняе трэцюю калонку табліцы "Ход вайны".

*Другая група* вызначае прычыны расколу шляхты Рэчы Паспалітай на два лагеры і ўтварэння *Варшаўскай і Сандамірскай канфедэрацый.* Вучні характарызуюць дзеянні канфедэрацый, адзначаюць, што яны наносілі вялікую шкоду народам Рэчы Паспалітай (Польшчы і ВКЛ).



gisdapamoga.bspu.by



Кароль Рэчы Паспалітай Аўгуст II Моцны.



Расійскі цар Пётр I.



Шведскі кароль Карл XII.

*Трэцяя група* вызначае гістарычнае значэнне бітвы каля вёскі Лясная 28 верасня 1708 г. у ходзе Паўночнай вайны. Вучні тлумачаць словы: "*Без поспеху на Сожы не была б здабыта перамога пад Палтавай у 1709 г. у вызначальнай бітве паміж расійскімі войскамі і галоўнымі сіламі Карла XII*". Пры выкананні задання вучні выкарыстоўваюць рэпрадукцыю гравюры Н.Лармесена з карціны Д.Мартэна-малодшага 1722—1724 гг. "Бітва каля вёскі Лясная" (с. 84 вучэбнага дапаможніка).

*Чацвёртая група* працуе з тэкстам § 14 вучэбнага дапаможніка і матэрыялам Энцыклапедыі гісторыі Беларусі, рыхтуе паведамленне "Карл XII і Паўночная вайна".

Пасля выканання пастаўленых перад групамі задач прадстаўнік ад кожнай групы агучвае адказ.

Настаўнік просіць вучняў растлумачыць новыя паняцці: *кааліцыя, канфедэрацыя, кантрыбуцыя.* Ён адзначае, што гэтыя паняцці трэба запомніць і ведаць іх сэнс, бо на ўроках гісторыі з імі давядзецца яшчэ не раз сустракацца.

***3. Бедствы насельніцтва Беларусі***

На аснове матэрыялу вучэбнага дапаможніка "Бедствы насельніцтва Беларусі", змешчанага на с. 84—85, вучні складаюць параўнальную табліцу.

Пасля запаўнення табліцы настаўнік прапануе вучням агучыць высновы па параўнальнай табліцы, выказаць меркаванні адносна дзеянняў войскаў розных дзяржаў на тэрыторыі Беларусі ў гады Паўночнай вайны 1700—1721 гг. Настаўнік можа

Бедствы насельніцтва Беларусі ў Паўночнай вайне

| Дата | Дзеянні рускіх войскаў і іх саюзнікаў | Дата | Дзеянні шведаў і іх саюзнікаў |
|---|---|---|---|
| 1701 г. | Рабаванне Віцебска на працягу 14 дзён саксонскімі рэйтарамі. | Студзень 1706 г. | Разбурэнне шведамі часткі Гродна. |
| 1705 г. | Пётр I расправіўся з уніяцкімі манахамі ў Полацкім Сафійскім саборы. Забітых манахаў спалілі, а попел выкінулі ў Дзвіну. Сафійскі сабор ператварылі ў вайсковы склад і стайню. У 1710 г. у выніку выбуху ён быў амаль цалкам знішчаны. | Люты — май 1706 г. | Шведы спалілі Карэлічы і Мір, разрабавалі Навагрудак, Слонім, Клецк, Слуцк, Пінск, Кобрын. |
| 1708 г. | Расійскія войскі пад камандаваннем Б.Шарамецева сабралі з віцебскіх мяшчан 7 тыс. чвэрцяў збожжа. | 1708 г. | Рабаванне беларускіх вёсак і гарадоў удзельнікамі Варшаўскай канфедэрацыі на чале з Сапегамі. |
| 28 верасня 1708 г. | Атрад казакоў і калмыкаў капітана Салаўёва выпаліў увесь Віцебск, Узгор'е, Заручаўе і Задунаўе, спаліў замкі, ратушу, 4 касцёлы і 20 цэркваў. | Ліпень 1708 г. | Шведскія войскі разрабавалі Магілёў, спалілі і разрабавалі праваслаўныя храмы ў Лідзе, Вілейцы, Докшыцах. |

паказаць слайды з выявамі Полацкага Сафійскага сабора да выбуху (рэканструкцыя) і пасля яго.

**Высновы:**

Як шведскія, так і расійскія войскі адчувалі сябе на беларускіх землях заваёўнікамі. Вынішчэнне насельніцтва гарадоў і вёсак, знішчэнне праваслаўных, каталіцкіх і пратэстанцкіх храмаў стала звычайнай справай. Беларускі народ у аднолькавай ступені пакутаваў як ад расійскіх, так і ад шведскіх заваёўнікаў.

***4. Вынікі і наступствы вайны.***

Настаўнік прапануе вучням паслухаць яго расказ і запоўніць чацвёртую калонку табліцы "Вынікі вайны".

У 1721 годзе ў г. Ніштат (Фінляндыя) быў падпісаны *Ніштацкі мір*. У выніку яго Расія атрымала:

— выхад да Балтыйскага мора (гэта значыць вярнула вусце ракі Нява, якое належала Ноўгараду Вялікаму ў XIII ст.);

— далучыла да сябе Ліфляндыю, Эстляндыю, Інгрыю, частку Карэліі.

Мірныя дагаворы з Саксоніяй і Рэччу Паспалітай Швецыя заключыла ў 1729 і 1733 гг. адпаведна. Для Рэчы Паспалітай гэта быў пачатак канца. Некалі магутная дзяржава ператварылася ў заезны двор і карчму для іншаземных войскаў, дзе "яны, як правіла, забываліся пра плату".

Наступствы вайны для беларускіх земель былі трагічныя:

— насельніцтва скарацілася на 700 тыс. чалавек (загінуў кожны трэці жыхар);

— адбывалася татальнае рабаўніцтва беларускіх земель з боку шведскіх і расійскіх войскаў;

— пачалася эпідэмія чумы (у выніку яе памерла каля 34 тыс. чалавек).

У заключэнне настаўнік робіць выснову, што пасля Паўночнай вайны (1700—1721 гг.) для ВКЛ паўстала цяжкая задача: адраджэнне гаспадаркі. Так ужо было ў гісторыі Беларусі пасля войнаў 1648—1651 гг. і 1654—1667 гг. Крывавы патоп прадаўжаўся, пра што будзе ісці размова ў наступным параграфе §15 "Барацьба магнацкіх груповак".

**III. Замацаванне новага матэрыялу.**

Па прапанове настаўніка замацаванне матэрыялу ажыццяўляецца ў творчай форме — шляхам напісання *сінквейнаў*. Прапануем чытачам наступныя іх варыянты:

№ 1
Пётр I.
Рашучы, злобны, жорсткі.
Імкнуўся, ваяваў, караў, памыляўся.
Здзейсніў розныя ўчынкі падчас вайны.
Цар — пераможца!

№ 2
Вайна!
Паўночная, крывавая, разбуральная.
Душыла, секла, мучыла, вынішчала.
Акупанты вынішчалі мой беларускі край.
Народ, не забывай!

**IV. Рэфлексія.**

У канцы ўрока настаўнік сумесна з вучнямі робіць высновы і падводзіць вынікі, каменціруе работу асобных вучняў і груп, выстаўляе адзнакі.



gisdapamoga.bspu.by



*Полацкі Сафійскі сабор.*
Макет першапачатковага выгляду.



*Полацкі Сафійскі сабор.* Сучасны выгляд.

Вучні выказваюць сваё стаўленне да ўрока, запаўняюць картку:

Я даведаўся ...

Я задумаўся над тым, што ...

Я раскажу сваім сябрам аб ...

**V. Дамашняе заданне:** прачытаць § 14; вусна адказаць на пытанні 1—9 на с. 86.

*Запоўненая табліца*

**Паўночная вайна 1700—1721 гг. на тэрыторыі Беларусі**

| Удзельнікі (краіны) | Прычыны вайны | Ход вайны | Вынікі вайны |
|---|---|---|---|
| Расія<br>Данія<br>Саксонія<br>Рэч Паспалітая<br>Швецыя | 1) Не дапусціць далейшага ўзвышэння Швецыі ў Паўночнай Еўропе.<br>2) Саксонія і Рэч Паспалітая прэтэндавалі на частку лівонскіх зямель.<br>3) Расія імкнулася атрымаць Балтыйскае ўзбярэжжа, каб мець выхад у Балтыйскае мора. | 1700 г. — разгром расійскіх войскаў пад Нарвай.<br>1701 г. — разгром саксонскага войска пад Рыгай.<br>1702 г. — шведскія войскі занялі Вільню, Варшаву, Гродна.<br>1708 г. — шведскія войскі пад Галоўчынам разбілі расійскі корпус А.Рапніна.<br>28.09.1708 г. — расійскія войскі разграмілі шведскі корпус А.Левенгаўпта каля вёскі Лясная.<br>1709 г. — перамога расійскіх войскаў пад Палтавай. Уцёкі Карла XII і Мазепы ў Турцыю.<br>Лістапад 1709 г. — капітуляцыя 15-тысячнага войска Казіміра Сапегі.<br>1710 г. — аднаўленне Паўночнага саюза і вяртанне Аўгуста II Моцнага на трон Рэчы Паспалітай.<br>1717 г. — спыненне ваенных дзеянняў Варшаўскай і Сандамірскай канфедэрацый.<br>1721 г. — заключэнне Ніштацкага міру. | 1) 1721 г. — падпісанне паміж Расіяй і Швецыяй Ніштацкага міру.<br>2) Расія далучыла да сябе Ліфляндыю, Эстляндыю, Інгрыю, частку Карэліі.<br>3) Расія замацавалася на паўднёвым узбярэжжы Балтыйскага мора і атрымала выхад да мора.<br>4) Насельніцтва Беларусі скарацілася на 700 тыс. чалавек, загінуў амаль кожны трэці жыхар.<br>5) Пачалася эпідэмія чумы, ад якой памерла каля 34 тыс. чалавек. |